**Список цитируемых источников**

1. *Андреев, А. А.* Средства новых информационных технологий в образовании: систематизация и тенденции развития / А. А. Андреев // Основы применения информационных технологий в учебном процессе ВУЗов — М. : ВУ, 1995. — С. 43—48.
2. *Швец, М. В.* Информационное обеспечение педагогических технологий в интегрированном обучении : учеб.-метод. комплекс / М. В. Швец. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2014. — 51 с.
3. *Малышева, М. А.* Информационные технологии в специальном образовании / М. А. Малышева // Спец. адукацыя. — 2017. — № 1. — С. 127—132.
4. *Филичева, Т. Б.* Основы логопедии / Т. Б. Филичева, Н. А. Чевелева, Г. В. Чиркина. — М. : Просвещение, 1989. — 223 с.
5. *Парамонова, Н. В.* Применение информационных и коммуникационных технологий в специальном образовании / Н. В. Парамонова // Дэфекталогія. — 2006. — № 1. — С. 3—13.
6. *Фролова, Н. П.* Использование интерактивной доски на коррекционных занятиях с учащимися с ОПФР / Н. П. Фролова // Спец. адукацыя. — 2014. — № 5. — С. 39—50.

УДК 378

**М. М. Кургузава**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жамчужненскі яслі-сад», аг. Жамчужны*

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАСТАЎНІКА-ДЭФЕКТОЛАГА СА СПЕЦЫЯЛІСТАМІ ЎСТАНОВЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ПА КАРЭКЦЫЙНА-РАЗВІВАЮЧАЙ ПРАЦЫ З ДАШКОЛЬНІКАМІ

**Уводзіны.** Аналізуючы сітуацыю, якая сёння склалася ў сістэме выхавання і навучання дзяцей, вельмі прыкметнай стала колькасць дзяцей, якія маюць адхіленні ў маўленчым развіцці. Значную частку з такіх дзяцей складаюць дзеці 4—6-гадовага ўзросту, якія не авалодалі ў нарматыўныя тэрміны правільным гукавымаўленнем. Такія дзеці складаюць асноўную групу рызыкі па непаспяховасці, нягледзячы на тое, што яны маюць паўнавартасны слых і інтэлект. Але адэкватныя метады, арганізацыйныя формы працы з дзецьмі, якія маюць цяжкія маўленчыя парушэнні, мэтанакіраванае ўздзеянне на дзяцей спрыяюць пераадоленню наяўных у іх маўленчых дэфектаў. Менавіта таму сёння, кажучы пра працу з дзецьмі-лагапатамі, нельга разглядаць толькі дзейнасць настаўніка-дэфектолага. Каб ліквідаваць маўленчыя парушэнні і сфарміраваць вусна-маўленчую базу, неабходна глыбокае ўзаемадзеянне ўсіх удзельнікаў педагагічнага працэсу, дзе вядучая роля належыць настаўніку-дэфектолагу [1, с. 24].

**Асноўная частка.** Поспех карэкцыйнай працы ў спецыяльнай і інтэграваных групах нашай установы дашкольнай адукацыі мы вызначылі строгай, прадуманай сістэмай, сутнасць якой заключаецца ў цесным узаемадзеянні ўсіх педагогаў дзіцячага сада, усяго выхаваўча-адукацыйнага працэсу, усяго жыцця і дзейнасці дзяцей. А менавіта стварэнне творчага саюза педагогаў, аб’яднаных агульнымі мэтамі, распрацоўка інтэграванага карэкцыйна-развіваючага каляндарна-тэматычнага плана работы, пабудаванага на аснове комплекснай дыягностыкі, арганізацыю карэкцыйна-адукацыйнага асяроддзя, якое стымулюе развіццё дзіцяці.

Практычны вопыт паказвае, што акрамя маўленчай паталогіі, дашкольнікам уласцівыя таксама і іншыя парушэнні ў развіцці псіхічнай сферы. Разам яны ўтвараюць складаны псіхалагічны профіль у псіхічным і пазнавальным развіцці дзяцей. Таму для паспяховай карэкцыі патрабуецца ўзгодненасць дзеянняў настаўніка-дэфектолага і іншых спецыялістаў.

Эфектыўнасць карэкцыйнай працы з дзецьмі спецыяльнай і інтэграваных груп вызначаецца спланаванай дзейнасцю пры наведванні ўстановы дашкольнай адукацыі, правільным размеркаваннем нагрузкі на працягу дня і пераемнасцю ў працы настаўніка-дэфектолага і іншых спецыялістаў дзіцячага сада.

У Жамчужненскім яслях-садзе функцыянуюць 12 груп, з іх 2 — спецыяльныя і 2 — інтэграваныя, якія наведваюць дзеці, пачынаючы з чатырох гадоў. Акрамя выхавальнікаў працуюць настаўнік-дэфектолаг, педагог-псіхолаг, музычны кіраўнік, кіраўнік па фізічнай культуры. Усе гэтыя катэгорыі педагогаў праводзяць заняткі з дзецьмі спецыяльнай і інтэграваных груп. Для таго каб працэс карэкцыйна-выхаваўчай працы быў больш паспяховым, было вырашана скаардынаваць свае дзеянні і аб’яднаць іх.

Узаемадзеянне ў працы пачынаецца з псіхолага-педагагічнага абследавання, якое праводзіцца настаўнікам-дэфектолагам сумесна з псіхолагам. Задача абследавання — вызначыць узровень агульнага і маўленчага развіцця кожнага дзіцяці. У першы тыдзень верасня выхавальнікі, настаўнік-дэфектолаг, педагог-псіхолаг і іншыя спецыялісты праводзяць комплекснае абследаванне развіцця дзяцей і на пасяджэннях круглага стала абмяркоўваюць вынікі абследавання, затым прыступаюць да планавання карэкцыйнай работы.

Сумесная карэкцыйная работа ў спецыяльнай і інтэграваных групах прадугледжвае рашэнне наступных задач: настаўнік-дэфектолаг фарміруе першасныя маўленчыя навыкі ў дзяцей-лагапатаў; выхавальнік замацоўвае сфарміраваныя маўленчыя навыкі.

© Кургузава М. М., 2019

Рэпазіторый БарДУ

Тут ён цалкам кіруецца метадычнымі ўказаннямі настаўніка-дэфектолага, якія фіксуюцца ў сшытку ўзаемадзеяння выхавальнікаў і настаўніка-дэфектолага па кожнаму дзіцяці паасобку і ўсёй групе ў цэлым. У сістэме планавання абраны прынцып патыднёвага вывучэння лексічных тэм, якога прытрымліваюцца ўсе спецыялісты ўстановы дашкольнай адукацыі. Вырашаючы агульныя задачы, ні той, ні іншы не падмяняюць адзін аднаго, кожнаму з іх прадастаўляецца свабода выбару і распрацоўкі прыёмаў і метадаў правядзення заняткаў. Праца выхавальніка па вывучэнні новай тэмы тыдня ў многіх выпадках папярэднічае лагапедычным заняткам, ствараючы неабходную пазнавальную і матывацыйную базу для фарміравання маўленчых навыкаў. Напрыклад, калі запланавана тэма «Восень. Праца людзей восенню», то выхавальнік праводзіць пазнавальныя заняткі, лепку ці маляванне па гэтай тэме, дыдактычныя, настольныя, сюжэтна-ролевыя, рухомыя гульні, гутаркі, назіранні, знаёміць дзяцей з творамі мастацкай літаратуры па дадзенай тэматыцы. А настаўнік-дэфектолаг на гэтым жа матэрыяле адпрацоўвае правільнае гукавымаўленне, развівае граматычны бок маўлення, працуе над развіццём звязнага маўлення. Педагог-псіхолаг вядзе карэкцыю асноўных псіхічных працэсаў, зняцце трывожнасці, эмацыйнага напружання. Гульні і заданні ён таксама праводзіць у адпаведнасці з гэтай тэмай. Музычны кіраўнік праводзіць педагагічную дыягностыку, на занятках вядзе работу па развіцці дробнай маторыкі рук, логарытміку, музычна-маўленчыя гульні на актывізацыю ўвагі, выхаванне музычнага рытму, арыентаванне ў прасторы, а таксама замацаванне лексічных тым, што спрыяльна ўплывае на фарміраванне маўленчых функцый у дзяцей з паталогіяй. Дзеці з парушэннямі маўлення часта саматычна аслабленыя, фізічна невынослівыя, хутка стамляюцца. Таму неабходна надаваць сур'ёзную ўвагу фізічнай культуры. Кіраўнік па фізічнай культуры праводзіць педагагічную дыягностыку, развівае рухальную актыўнасць з дапамогай рухомых гульняў рознай складанасці, удасканальвае маторныя навыкі, фарміруе гульнявыя навыкі, удасканальвае прасадычныя кампаненты гаворкі.

Калектыў дзіцячага сада пастаянна шукае новыя формы работы з дзецьмі. Даследаваннямі ўстаноўлена, што ўзровень развіцця маўлення дзяцей знаходзіцца ў прамой залежнасці ад ступені сфарміраванасці тонкіх дыферэнцыраваных рухаў рук. Таму маўленчае развіццё рэкамендуецца стымуляваць трэніроўкай рухаў пальцаў рук, асабліва ў дзяцей з маўленчай паталогіяй. Выхавальнік, згодна з парадамі настаўніка-дэфектолага, кіруючыся праграмнымі патрабаваннямі, паслядоўнасцю вывучэння лексічных тэм, уключае ў свае заняткі пальчыкавую гімнастыку, практыкаванні на каардынацыю гаворкі і руху, вусныя практыкаванні па развіцці лексіка-граматычнага ладу маўлення, якія спрыяюць фарміраванню навыкаў звязнага маўлення. На занятках па маляванні выкарыстоўваюцца нетрадыцыйныя формы мастацка-графічнай тэхнікі: маляванне пальчыкамі, друк па трафарэтах, складванне арыгамі і г. д. Выбар прыёмаў працы з выкарыстаннем дадзеных тэхнік, планаванне дзейнасці па мастацкай творчасці на ўвесь навучальны год ідзе ў адпаведнасці з лексічнымі тэмамі, што вывучаюцца ў ходзе лагапедычнай адукацыйнай дзейнасці. Для забеспячэння і падтрымання цікавасці да заняткаў выкарыстоўваюцца вершы, загадкі, практыкаванні на развіццё каардынацыі гаворкі з рухам [2, с. 81].

Пры складанні індывідуальнай карэкцыйнай работы з дзецьмі мы ўлічваем асаблівасці іх увагі, памяці і іншых псіхічных працэсаў. Як паказвае вопыт, метады і тэхналогіі працы настаўніка-дэфектолага і выхавацеля паспяхова дапаўняюць адзін аднаго. Гэта дазваляе скараціць час на фарміраванне і замацаванне атрыманых ведаў і ўменняў, дамагчыся паспяховага іх пераносу на іншыя віды адукацыйнай і гульнявой дзейнасці дашкольнікаў. Спосабы ўзаемадзеяння спецыялістаў забяспечваюць комплекснае рашэнне карэкцыйных, выхаваўчых, адукацыйных задач і значна павышаюць эфектыўнасць педагагічнага працэсу. У аснове зладжанай работы настаўніка-дэфектолага і іншых спецыялістаў ляжаць наступныя прынцыпы: комплекснага падыходу да арганізацыі карэкцыйна-педагагічнага працэсу; адзінства дыягностыкі і непасрэднага карэкцыйна-педагагічнага працэсу; супрацоўніцтва паміж настаўнікам-дэфектолагам, выхавацелямі і дзецьмі; уліку інтарэсаў усіх удзельнікаў карэкцыйна-педагагічнага працэсу; дыферэнцыраванага падыходу да дзяцей у працэсе выхавання ў іх правільнага маўлення.

Для рэзультатыўнасці работы намі былі распрацаваны: перспектыўны план узаемадзеяння са спецыялістамі; сшыткі ўзаемасувязі з выхавацелямі названых груп для арганізацыі карэкцыйнай работы ў другой палове дня.

Настаўнік-дэфектолаг і іншыя спецыялісты ўстановы дашкольнай адукацыі прад'яўляюць адзіныя патрабаванні да дзіцяці з маўленчымі адхіленнямі. Пры гэтым улічваецца структура парушэння. Ажыццяўляецца індывідуальны падыход на фоне калектыўнай дзейнасці; замацоўваюцца веды, уменні і навыкі, набытыя на ўсіх занятках.

Узаемадзеянне паміж спецыялістамі ажыццяўляецца і ў такіх формах работы, як кансультацыі, семінары-практыкумы, сумесныя гутаркі па падвядзенні вынікаў карэкцыйна-выхаваўчай работы і вызначэнні перспектыў далейшай дзейнасці. Вырашыць маўленчыя праблемы дзяцей можна толькі пры цеснай сумеснай працы ўсіх супрацоўнікаў дзіцячага садка. Кожнаму спецыялісту адведзена свая сфера прафесійнай дзейнасці, якая скіравана на дыягностыку, папярэджанне і карэкцыю наяўных адхіленняў у развіцці дзіцяці ў той ці іншай адукацыйнай галіне. Абмен прафесійнай інфармацыяй пра асаблівасці развіцця таго ці іншага дзіцяці прадугледжаны рэгламентам рабочых нарад, педсаветаў, але звычайна неабходнасць узаемнага абмену думкамі ўзнікае часцей. Таму кожны з нас інфармуе адзін аднаго пра асаблівасці развіцця дзяцей, канкрэтызуючы менавіта тую частку інфармацыі, якая можа быць карысная



Рэпазіторый БарДУ

спецыялістам у вырашэнні вузкапрофільных задач. Каб дасягнуць станоўчага выніку ў карэкцыйнай працы з дзецьмі, у нас узнікла неабходнасць змяніць форму і змест адукацыйнай дзейнасці і выкарыстоўваць комплексна-гульнявы метад арганізацыі элементарнай адукацыйнай дзейнасці. Сюжэтна-тэматычная арганізацыя дзейнасці ў гульнявой форме больш мэтазгодная для актывізацыі звязнага маўлення, развіцця пазнавальных працэсаў і адпавядае дзіцячым псіхафізічным дадзеным, бо ў гульні максімальна рэалізуюцца патэнцыйныя магчымасці дзяцей. Выніковасць і эфектыўнасць такой працы прасочваецца ў параўнанні дыягностыкі спецыялістаў у пачатку і ў канцы навучальнага года.

**Заключэнне.** Толькі цесны кантакт у працы спецыялістаў можа спрыяць ліквідацыі розных праблем у дашкольным узросце, а значыць, і далейшаму паўнавартаснаму школьнаму навучанню.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Баль, Н. Н.* Логопедическая работа с детьми дошкольного возраста с тяжёлыми нарушениями речи : учеб.-метод. пособие для учителей-дефектологов дошк. учреждений / Н. Н. Баль, Н. В. Дроздова. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2010. — 152 с.
2. Современные подходы в работе с детьми с тяжёлыми нарушениями речи в учреждении дошкольного образования / сост.: С. А. Билая [и др.] ; под общ. ред. С. А. Билой. — Мозырь : Белый Ветер, 2014. — 146, [2] с. : ил.

УДК 376.3

**О. В. Никулина**
*Государственное учреждение образования «Дошкольный центр развития ребёнка п. Дитва», п. Дитва*

## ЭТАПЫ КОРРЕКЦИОНОЙ РАБОТЫ ПО РАЗВИТИЮ СВЯЗНОЙ РЕЧИ У ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА С ОБЩИМ НЕДОРАЗВИТИЕМ РЕЧИ

**Введение.** Связная речь является смысловым развернутым высказыванием, которое обеспечивает общение и взаимопонимание людей. Формирование связной речи, изменение её функций является следствием усложняющейся деятельности ребёнка и зависит от содержания, условий и форм общения ребёнка с окружающими. Функции речи складываются параллельно с развитием мышления, они неразрывно связаны с содержанием, которое ребёнок отражает посредством языка. Связная речь неотделима от мира мыслей: связность речи — это связность мыслей. В связной речи отражается логика мышления ребёнка, его умение осмыслить воспринимаемое и правильно выразить его. По тому, как ребёнок строит свои высказывания, можно судить об уровне его умственного развития [1, с. 78].

Довольно часто встречающимся видом нарушений средств общения является общее недоразвитие речи (далее — ОНР) у детей с нормальным слухом и сохранным интеллектом. При общем недоразвитии нарушены или отстают от нормы основные компоненты речевой системы: лексический, грамматический и фонетический строй. Также наблюдается нарушения и в связной речи [2].

Речевой опыт дошкольников с ОНР весьма ограничен, языковые средства, которыми они пользуются, являются несовершенными. Данная категория детей далеко не полностью удовлетворяет потребность устного общения. Отсюда связная речь у дошкольников с ОНР оказывается бедной, малословной, тесно связанной с определённой ситуацией.

**Основная часть.** Успех формирования правильной речи у дошкольников зависит от степени продуктивности процесса закрепления речевых навыков и умений. Перед всеми педагогами, работающими с детьми с ОНР, стоят и коррекционные, и общеобразовательные задачи. Коррекцией речевого и общего развития детей дошкольного возраста с ОНР занимается не только логопед, но и воспитатель. Если логопед развивает и совершенствует речевое общение детей, то воспитатель закрепляет их речевые навыки, полученные на логопедических занятиях.

Закрепление у детей навыков связного высказывания может происходить как на фронтальных занятиях по развитию речи, так и во время занятий по познавательному развитию, изобразительному, трудовому развитию и в других видах деятельности. На занятиях необходимо использовать такие приемы, как объяснения, вопросы, речевой образец, демонстрация наглядного материала, упражнения, оценка речевой деятельности и др. При проведении того или иного занятия педагогу следует находить наиболее эффективные варианты сочетания различных приёмов с тем, чтобы повышать активность и самостоятельность детей.

В процессе работы над связной речью дошкольников с ОНР необходимо придерживаться определённого плана. Рекомендуется осуществлять коррекционную работу поэтапно, для правильного и постепенного развития связной речи детей [3; 4].

Вся коррекционная работа включает в себя три этапа. На каждом этапе проводится работа по развитию словаря, фразовой речи и подготовке к связному высказыванию. Изначально дети должны овладеть навыками пересказа. Для этого выбирается знакомый для дошкольников текст. Это может быть не-

© Никулина О. В., 2019

Репозиторий БарГУ